Пошукі ў скарбонцы народнага мастацтва не спыняюцца. Рэжысёр А.Жугжда і мастак Л.Мікіна ў пастаноўцы спектакля "Пілiпка і Ведзьма" па п'есе С.Кавалёва спалучылі дзве цікавыя рэчы: тэатр ценяў, стылізаваны пад батлейку, і тэхніку старажытнага, забытага народнага мастацтва выцінанкі. Узяўшы за аснову тэхніку народнага мастацтва выцінанкі, рэжысёр і мастак ствараюць арыгінальнае відовішча – тэатр ценяў у батлейкавым варыянце. Спектакль з'явіўся значным здабыткам лялечнага мастацтва Беларусі.

Такім чынам, сённяшнія творчыя намаганні лялечнай рэжысуры, сцэнаграфіі, звернутыя ў глыбіню стагоддзяў нашай культурнай спадчыны, знаходзяць новыя цікавыя ідэі ў самых розных напрамках мастацкай выразнасці.

**Ю.М.Бяспалы,**
*аспірант*

## УПЛЫЎ АСВЕТНІЦКІХ ІДЭЙ XVIII ст. НА ФАРМІРАВАННЕ ПРАВАВЫХ ПРЫНЦЫПАЎ СПРАВЯДЛІВАСЦІ, ДОБРАСУМЛЕННАСЦІ І РАЗУМНАСЦІ

Адпаведная навуковая ацэнка дасягненняў эпохі Асветніцтва ў поўную меру пачала развівацца толькі ў 30-я гады XX ст. Яна прыйшла на змену нігілістычным адносінам, якія яскрава праявіліся ў прадстаўнікоў рамантызму, да галоўнай ідэі асветнікаў аб розуме як найважнейшым крытэрыі ў ацэнцы ўсіх сфер сацыякультурнага жыцця. Хаця найбольш вядомы ідэі Асветніцтва XVIII ст., аднак іх вытокі знаходзяцца ў навуковых высновах, закладзеных вялікімі папярэднікамі Ньютанам, Локам і інш.

Галоўным дэвізам эпохі Асветніцтва, згодна вельмі трапнаму выслоўю І.Канта, маглі б стаць словы: "Валодай мужнасцю карыстацца ўласным розумам" [2, с. 455].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзякуючы імкненню да асэнсавання рэчаіснасці праз розум, якое ахапіла адукаваныя колы многіх еўрапейскіх краін, узніклі разнастайныя асветніцкія кірункі. Відавочна, яны фарміраваліся не як тэарэтычныя сістэмы, а ў выглядзе своеасаблівых ідэалагічных рухаў, спецыфічных для кожнай краіны.

Аднак усе яны мелі адзіную аснову—веру ў розум, якому пад сілу забяспечыць прагрэс чалавецтва. Сярод галоўных заслуг асветніцкага розуму можна назваць абгрунтаванне этычнай цярпімасці, абарону прыродных правоў чалавека і грамадзяніна. Пад прыродным (сутнасным) асветнікі разумелі рацыянальнае, а не звышсутнасное (ірацыянальнае).

Абгрунтаванне асветнікамі тэорыі прыроднага (сутнаснага) права абумовіла прызнанне рацыянальнасці і ўсеагульнасці закона, неаспрэчнасці права. На падставе прыроднага права былі распрацаваны ідэі аб правах чалавека і грамадзяніна, якія знайшлі адбітак у “Дэкларацыі правоў чалавека і грамадзяніна” (1789). Прыроднымі правамі абвяшчаліся свабода, роўнасць у правах, прыватная маёмасць і інш. Хаця, як лічаць даследчыкі, прыкладам для французскай Дэкларацыі стала амерыканская “Дэкларацыя правоў, прынятых прадстаўнікамі добрага народа, які сабраўся ў поўнай і свабоднай згодзе ў Вірджыніі” (1776). У § 1 гэтага дакумента гаворыцца “Усе людзі нараджаюцца і застаюцца свабоднымі і роўнымі ў правах...” [2, с. 464].

Нельга не заўважыць, што ідэал асветнікаў аб прыродным праве мае ў сваёй аснове “залатое” правіла маралі — не рабі нікому таго, чаго б табе не хацелася для сябе. А выканаць гэтае правіла можна толькі тады, калі дзейнічаюць юрыдычныя нормы, якія прадугледжваюць роўнасць у правах ці абавязках, адмену ўсіх відаў юрыдычнага нераўнапраўя, абумоўленага нараджэннем, прафесіяй, сацыяльным станам і інш.

Адным з дасягненняў асветнікаў можна лічыць тэарэтычную распрацоўку канцэпцыі справядлівасці і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

правасуддзя. Галоўная заслуга ў гэтым належала Ш.Мантэск'е, які даказваў, што справядлівасць — гэта суадносіны, сапраўды існуючыя паміж дзвюма рэчамі, заўсёды аднолькавымі, а правасуддзе мае вытокі не ў прымусовых дзяржаўных законах, а ў дабрачыннасці [2, с. 531].

Такім чынам, французскі філосаф суадносіць справядлівасць з прыроднымі (сутнаснымі) правамі чалавека, а не звязвае яе з тэалагічнымі прычынамі. Заслугоўвае ўвагі вызначэнне Ш.Мантэск'е трох формаў праўлення, якія, на думку вучонага, абумоўлены этычнымі прынцыпамі: рэспубліканская — дабрачыннасцю, манархічная — гонарам і дэспатычная — жахам. Ш.Мантэск'е лічыць, што "форма ці прырода праўлення робіць нас тым ці іншым, а прынцып прымушае працаваць" [2, 534].

Згодна шматвяковай традыцыі адной з кардынальных формаў дабрачыннасці з'яўляецца справядлівасць. Маральна-прававой умовай справядлівасці ў адносінах да іншых выступае роўнасць. У прававым аспекце яна выступае як фармальная роўнасць, таму што індывіды зраўноўваюцца паміж сабою як суб'екты права. Гэтай праблеме значную ўвагу надаваў нямецкі асветнік Х.Тамазій. Ён вызначаў своеасаблівасць юрыдычнага разумення справядлівасці, параўноўваючы яе з маральным тэрмінам "сумленнасць", тым самым паказваючы адрозненне прававых катэгорый ад маральных.

Ідэі аб роўнасці людзей і іх прыродным праве аказалі ўплыў на грамадскае жыццё Рэчы Паспалітай і Беларусі. У сувязі з тым, што каля 4,5 млн. сялян у краіне заставаліся прыгоннымі, аб справядлівасці не магло быць размовы. Думкі аб неабходнасці прагрэсіўных рэформаў на падставе вучэння аб прыродным праве ўтрымліваліся ў апублікаваных ананімна " патрыятычных пісьмах" І.Выбіцкага, у "Роздумах аб жыцці" Я.Замойскага і "Папярэджанні Польшчы" С.Стэшыца. Французскія асветнікі Маблі і Ж.-Ж.Русо, якія наведалі Рэч Паспалітую , актыўна падтрымлівалі пабудову



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сістэмы справядлівых адносін у грамадстве праз магчымасць "пазбаўлення шляхецтва права на неабмежаваны суд над сваімі падданымі і з некаторай надзеяй на поспех — звяртацца да законаў людскіх (прыродных)" [1, с. 100—101].

Такія ідэі аказалі пэўны ўплыў на асобных прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя Беларусі. На памежжы XVIII—XIX стст. на грамадскае жыццё ў значнай меры ўплывалі погляды К.Нарбута, А.Загурскага, І.Храптовіча і інш. Калі А.Загурскі наогул разважаў аб неабходнасці на месца самавольства паставіць закон, а К.Нарбут заклікаў выконваць законы, то І.Храптовіч, які падтрымліваў ідэю прыроднага права і лічыў, што "набліжэнне закона да такога права вызначае ступень яго справядлівасці" [3, с. 216], на практыцы ажыццявіў прынцып справядлівасці, правёўшы сур'ёзныя аграрныя рэформы ў сваіх маёнтках. Яго ўчынак падтрымалі К.Бжастоўскі, Г.Яблонская і інш.

Такім чынам, актыўная пераацэнка асветнікамі розных бакоў сацыякультурнага развіцця ў XVIII і папярэдніх стагоддзях прывяла іх да ўпэўненасці ва ўсемагутнасці розуму, існаванні прыродных правоў чалавека і фарміраванні асноўных прынцыпаў грамадскага жыцця — свабоды, роўнасці, братэрства. Дзеля дасягнення фармальнай роўнасці на падставе асветніцкіх ідэй распрацоўвалася грамадзянскае заканадаўства, якое гарантавала справядлівасць, добрасумленнасць, разумнасць як зместу законаў, так і іх ужыванню на практыцы.


*1. Мякотин В.* Крестьянский вопрос в Польше. — СПб., 1889. — 247 с.

*2. Реале Дж., Антисери Д.* Западная философия от истоков до наших дней. — СПб.: Петрополис, 1996. — Т. 3: Новое время. — 736 с.

*3. Очерки* истории философской и социологической мысли в Белоруссии (до 1917 г.). — Мн.: Наука и техника, 1973. — С. 196—263.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ